# КНІЖНАЯ ГРАФІКА ЯЎГЕНА КУЛІКА

***Трусаў Алег Анатольевіч,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Выдатны беларускі мастак Яўген Сяргеевіч Кулік нарадзіўся ў 1937 г. і пакінуў пасля сябе выдатную мастацкую спадчыну, у тым ліку ў галіне станковай і кніжнай графікі, а таксама экслібрыса. Варта адзначыць, што Яўген Кулік – адзін з распрацоўшчыкаў дзяржаўных сімвалаў (сцяга і герба) незалежнай Беларусі ў 1991 г.

Сярод найбольш цікавых кніжных ілюстрацый Я. Куліка варта адзначыць малюнкі да кнігі “Слова пра паход Ігаравы” (1963), нізку лінарытаў “Помнікі дойлідства Гарадзеншчыны” (1974), ілюстрацыі да кнігі Уладзіміра Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” (1978) і найбольш выключную працу, дзе мастак зрабіў не толькі ілюстрацыі, але і макет кнігі – “Песня пра зубра” Міколы Гусоўскага, што пабачыла свет у 1979 г.

У сваім артыкуле я хачу звярнуць увагу на серыю малюнкаў-рэканструкцый “Замкі Беларусі”, зробленых прыкладна ў 1977 г.



Камянец XIII ст. Рэканструкцыя (малюнак Я. Куліка)

Беларускую архітэктуру малявалі з натуры і па памяці шмат якія айчынныя мастакі XVIII–XX стст. Дастаткова толькі згадаць імёны Іосіфа Пешкі, Васіля Гразнова, Эдуарда Паўловіча і асабліва Напалеона Орды. Непасрэдным папярэднікам Яўгена Куліка быў Язэп Драздовіч, які ў 20–30-я гады XX ст. замаляваў шмат якія замкі Заходняй Беларусі. Але гэта былі малюнкі з натуры.

Гістарычныя рэканструкцыі помнікаў нашага дойлідства рабілі ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўным архітэктары і рэстаўратары. Адным з першых быў Пётр Пакрышкін, які зрабіў навуковую рэканструкцыю Каложскай (Барысаглебскай) царквы XII ст. Вядома некалькі навуковых рэканструкцый старажытных полацкіх помнікаў, асабліва Полацкай Сафіі і Спаса-Прэабражэнскай царквы Еўфрасіннеўскага манастыра.



Лідскі замак. Рэканструкцыя (малюнак Я. Куліка)

Спрабаваў сябе ў гэтай справе і Яўген Кулік. Акрамя ўжо згаданых мною лінарытаў помнікаў дойлідства Гродзеншчыны, Я. Кулік у 1996 г. намаляваў трыпціх “Усяслаў Чарадзей, Ефрасіння Полацкая, Лазар Богша”. Адзін з персанажаў гэтага твора Усяслаў Чарадзей трымае ў руках мадэль храма XI ст. славутай Полацкай Сафіі. Дарэчы, праз некалькі гадоў рэстаўратары пад кіраўніцтвам Уладзіміра Ракіцкага ў келлі Ефрасінні Полацкай у Спаса-Прэабражэнскай царкве знайшлі фрэску, на якой намалявана славутая палачанка з макетам закладзенага ёю храма XII ст. Прычым дынаміка малюнка, яго кампаноўка вельмі нагадвае твор Яўгена Куліка, што сведчыць пра яго вельмі глыбокае веданне гістарычнага матэрыялу.



Крэўскі замак. Рэканструкцыя (малюнак Я. Куліка)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш яго талент раскрыўся ў канцы 70-х гг. XX ст., калі ён працаваў разам з выдатным беларускім археолагам Міхасём Ткачовым. Міхась Ткачоў спалучаў свае археалагічныя даследаванні абарончай архітэктуры Беларусі з грунтоўнымі архіўнымі пошукамі.

Такім чынам, Яўген Кулік атрымліваў ад свайго сябра не толькі вынікі археалагічных даследаванняў шурфоў і раскопаў, але і гістарычныя малюнкі, схемы і планы старажытных будынкаў.



Навагрудскі замак. Рэканструкцыя (малюнак Я. Куліка)

У 1977 г. рэспубліканскае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі выдала кнігу Міхася Ткачова “Замкі Беларусі”, якая потым некалькі разоў перавыдавалася і карысталася вялікім попытам у аматараў беларускай гісторыі.

У гэтай кнізе змешчаны шэсць малюнкаў-рэканструкцый Яўгена Куліка: “Старажытны Камянец”, “Замак у Навагрудку”, “Лідскі замак”, “Мірскі замак у пачатку XVII ст.”, “Замак у Геранёнах”.



Мірскі замак. Рэканструкцыя (малюнак Я. Куліка)

Наступная кніга Міхася Ткачова, манаграфія “Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст.”, выйшла ў 1978 г. Да вышэйзгаданых малюнкаў-рэканструкцый Я. Куліка дадаліся яшчэ два: “Заслаўскі замак XVII ст.” і “Нясвіжскі замак”.

Пасля гэтага малюнкі Я. Куліка друкаваліся не толькі ў кнігах



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. Ткачова, але і шмат у якіх энцыклапедыях, даведніках і падручніках, пачалі жыць сваім самастойным жыццём.

Таму мы паспрабуем даць аналіз кожнаму з іх у храналагічным парадку.



Замак у Гераненах. Рэканструкцыя (мастак Я. Кулік)

На малюнку “Камянец XIII ст.” паказаны не ўвесь сярэднявечны горад, што тады належаў Валынскаму князю, а толькі яго ўмацаваная частка, драўляны дзядзінец з каменнай вежай-данжонам у сярэдзіне. Побач з высокай вежай намалявана драўляная царква і драўляная забудова дзядзінца. Уваход у дзядзінец здзяйсняўся праз драўляную вежу-браму.

Вялікую цікавасць уяўляе рэканструкцыя Лідскага замка XIV ст. На малюнку бачныя два ўваходы ў замак, а таксама запасны ўваход у суседняй замкавай сцяне. Добра намалявана выява “Пагоні” над галоўным уваходам, у які можна было патрапіць па драўляным мосце. Яўген Кулік не забыўся дакладна намаляваць стромкія дахі замкавых вежаў, пакрытых дахоўкай.

Аднак ёсць тут і недакладнасці. Няма на рэканструкцыі выявы данскера на замкавай сцяне, двух калодзежаў на двары і дэкаратыўнага архітэктурнага пояса на верхніх частках муроў. Брукаваны замкавы двор адпавядае вынікам археалагічных раскопак.

Рэканструкцыі Крэўскага і Лідскага замкаў падобныя, бо абодва належаць да аднаго тыпу. Гэта абарончыя замкі-кастэлі, якія ўзводзіліся на выспах, часта часткова штучных, пасярод балоцістай мясцовасці. Таму вакол Лідскага і Крэўскага замкаў водная прастора. Найбольш дэталёва намалявана галоўная Княская вежа. Драўляная забудова на замкавым двары каля Княскай вежы была пацверджана археалагічнымі раскопкамі 1985 г. Аднак існаванне забудовы каля



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малой замкавай вежы не было абгрунтавана археолагамі.

Вельмі дакладна зроблена рэканструкцыя сямівежавага замка ў Наваградку, які з’яўляўся адным з самых умацаваных у ВКЛ. Акрамя вежаў на замкавым падворку мы бачым будынак царквы, падмуркі якой былі знойдзены польскімі археолагамі ў 20-х гг. мінулага стагоддзя. Намаляваў Яўген Кулік і двухпавярховы палац, які месціўся ў куце замка паміж дзвюма вежамі. Яго рэшткі таксама знойдзены ў 1920-я гг. Не хапае на малюнку выявы каменнага двухпавярховага будынка, які стаяў пасярэдзіне замкавага двара непадалёк ад царквы. Ён быў цагляны з зашклёнымі вокнамі і накрыты чырвонай дахоўкай. Яго рэшткі былі знойдзены і вывучаны археолагам з Санкт-Пецярбурга Марыянай Малеўскай, якая разам з Фрыдай Гурэвіч вывучала Наваградскі замак у 70–80 гг. XX ст.



Нясвіжскі замак. Рэканструкцыя (малюнак Я. Куліка)

Рэканструкцыя славутага Мірскага замка зроблена паводле яго стану на пачатак XVII ст., калі ён належаў Радзівілам. У гэты час ужо існавалі бастыённыя ўмацаванні вакол замка, а таксама дадатковы ўзмацняльнік – прадбрам’е паўкруглай формы перад вежай-брамай. Выклікае сумненне толькі вежа-брама сярод адной з курцін бастыённай абароны вакол замка. Старажытныя малюнкі з яе выявай невядомы, а падчас археалагічных раскопак яе падмуркі знойдзены не былі.

Вялікую цікавасць уяўляе малюнак-рэканструкцыя замка ў Геранёнах. Чатырохвежавы замак з двухпавярховым палацам быў дадаткова ўмацаваны па перыметры землянымі валамі, якія мелі мураваныя паўвежы-рандэлі. Дарэчы, гэты замак, апроч Міхася Ткачова, ніхто не вывучаў, і ён чакае ўдумлівых даследчыкаў. М. Ткачоў лічыў замак у Геранёнах унікальным фартыфікацыйным комплексам, праабразам будучых бастыённых замкаў на Беларусі.

Нясвіжскі замак М. Ткачоў археалагічна не даследаваў, і таму Яўген Кулік зрабіў яго рэканструкцыю на аснове пісьмовых крыніц (а

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

іх захавалася багата) і тагачаснага выгляду замка. Магчыма, археалагічныя даследаванні, якія вядуцца на замкавым падворку ў апошнія гады, змогуць унесці нейкія карэктывы ў зробленую М. Ткачовым і Я. Кулікам рэканструкцыю выявы замка на XVII–XVIII ст.



Заслаўскі замак XVII ст. Рэканструкцыя (аўтар Я. Кулік)

Вельмі дакладна зрабіў мастак выяву бастыённага Заслаўскага замка XVII ст. Намаляваны магутныя бастыёны і курціны, цагляная вежа-брама з пад'ёмным мостам. На замкавым двары добра відаць цагляныя муры хрысціянскага храма, які быў і кальвініцкім зборам, і каталіцкім касцёлам, і праваслаўнай царквой. Шкада, што Я. Кулік не паказаў побач з храмам будынак палаца, рэшткі якога знайшлі археолагі.

Пры аздабленні кнігі "Песня пра зубра" Я. Кулік, малюючы картусхему сярэднявечнай Беларусі ад Супрасля, Трокаў і Вільні на Захадзе да Мсціслава і Смаленска на Усходзе, выкарыстаў свае папярэднія рэканструкцыі. Гэта крыху схематычныя, але дакладныя выявы замкаў у Лідзе, Крэве і Міры.

6 лістапада 2005 г. ў кавярні-фальварку "Добрыя Мыслі" ў Мінску была адкрыта выстава твораў Яўгена Куліка, прымеркаваная да адкрыцця помніка мастаку на Кальварыйскіх могілках у Мінску. На гэтай выставе сярод іншых прац былі і ўнікальныя выявы помнікаў беларускага дойлідства.

Было б добра сабраць разам і выдаць асобнай брашурай або наборам паштовак гістарычныя рэканструкцыі і сучасныя выявы помнікаў архітэктуры Беларусі, зробленыя Яўгенам Кулікам – прадаўжальнікам справы Напалеона Орды і Язэпа Драздовіча.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Ткачоў М. Замкі Беларусі (XIII–XVIII стст.) / М. Ткачоў. – Мн. : Полымя, 1977. – С. 9, 20, 31, 35, 43, 48.

2. Ткачоў М. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. / М. Ткачоў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1978. – С. 23, 31, 38, 51, 69, 78, 82, 85.

3. Ткачоў М. Замкі і людзі / М. Ткачоў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – С. 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ